**Занятак па адукацыйнай вобласці “Мастацкая літаратура” для дзяцей 3-4 гадоў “Казка завітала ў госці”**

**Праграмны змест:**

1. Садзейнічаць фарміраванню звязнага маўлення дзяцей у працэсе азнакамлення з казкай “ Кот, пеўнік і ліса”,
2. Забяспечыць умовы для зносін дзяцей на беларускай мове ў час інсцэніроўкі казкі.
3. Развіваць моўную актыўнасць у працэссе сумеснай дзейнасці, увагу, мысленне, памяць.
4. Далучаць дзяцей да багацця беларускай мовы, пашыраць уяўленне пра казку, як твор беларускай народнай творчасці.

**Папярэдняя работа**: чытанне беларускіх народных казак, гутаркі па іх зместу, разглядванне ілюстрацый, драматызацыя.

**Матэрыял:** куфар,малюнкі, настольны тэатр, лялька Надзейка.

**Ход заняткаў**

**Арганізацыя дзяцей.** Выхавацель прапануе дзецям сесці на крэселкі, таму што зараз прыйдзе госць.

**Сюрпрызны момант «Прывітанне»**.

Мэта: фарміраванне ўменняў вітацца на беларускай мове, выкарыстоўваць, пры гэтым, розныя варыянты слоў

Абсталяванне: лялька Надзейка, куфар.

Раздаўся стук.

Дзеці, да нас зноў прыйшла лялька Надзейка. Давайце павітаемся з ёй. Добры дзень! А як яшчэ можна прывітацца па-беларуску? (прывітанне, добрай раніцы)

**Гульнявое заданне “Назаві казку”**

Мэта: замацаванне знаёмых назваў беларускіх народных казак.

-А што гэта Надзейка нам прынесла? Куфар, а ў куфары што у нас? (дастае) Паглядзіце-малюнкі, да не простыя, а з казак. А вы добра ведаеце беларускія казкі? (Так). Добра, зараз мы гэта праверым. Прапаную вам пагуляць у такую гульню: я вам паказваю малюнак казкі, а вы ўспомніце, як называецца гэта казка. Калі здагадаецеся – падымайце руку.

Паказ малюнкаў з выявамі герояў казак.

**Творчае рухомае заданне “Пераўтварыся ў казачнага героя”**

Мэта: фарміраванне ўменне падбіраць рухі ў залежнасці ад характару героя. Развіццё ўвагі, творчасці пры стварэнні вобразу, спрыянне добраму настрою.

**Выхавальнік:** Малайцы. А зараз давайце погуляем у вясёлыя малюнкі. Паглядзіце, хто гэта? (назвалі) А давайце паходзім, як мядзведь (і г.д)

**5 малюнкаў**

Зайка-паскакалі

Ліса-крадзецца

Мядзведзь-кульгае

Пеўнік- маршыруе, махае крыламі

Курачка-квокча

Коцік-гладзіцца, мяўкае

**Тэатралізацыя беларускай народнай казкі**

Мэта: фарміраванне ўменняў слухаць і эмацыянальна ўспрымаць літэратурны твор, сачыць за развіццём сюжэту.

Надзейка, а што там яшчэ у куфары? Казачныя героі! Якія прыгожыя! Назавіце, хто гэта? І яны вам хочуць вам паказаць казку. Лялька Надзейкка таксама з вамі паглядзіць. (пасадзіць ляльку). Сядайце роўненька. Казка называецца "Кот, пеўнік і лісіца"

**Апавядальнік.** Жылі-былі коцік і пеўнік. Добра жылі, дружна. Коцік на паляванне хадзіў, а пеўнік есці варыў, хатку падмятаў, песні спяваў. Аднойчы пайшоў коцік на паляванне, а пеўнік зачыніў за ім дзверы, ды пачаў абед варыць. Бяжыць лісіца, убачыла хатку, падскочыла да акенца:

**Ліса.** Гэй, хто тут гаспадар?

**Пеўнік** — Я

**Ліса.** Пусці ў хатку.

**Пеўнік** — Чаго?

**Ліса.** — Пасяджу трохі, адпачну з дарогі.

**Апавядальнік.** Пеўнік добры быў, пусціў лісіцу ў хатку, а лісіца — цап! — ухапіла яго і панесла дадому. Апамятаўся пеўнік, закрычаў на ўвесь лес:

**Пеўнік** — Коце, браце!
Мяне ліска нясе
У высокія горы,
У глыбокія норы,
Па барах, да карчах,
Аж бярэ мяне страх!..

**Апавядальнік.** Пачуў гэта коцік, прыбег, адабраў у лісіцы пеўніка і завёў яго назад у хатку.

**Коцік.** Ну, глядзі ж, другі раз не пускай лісіцу, бо цяпер я далей пайду і магу не пачуць цябе.

**Пеўнік** Добра,  не пушчу.

**Апавядальнік.** Зноў пайшоў коцік на паляванне. А лісіца — як тут была.

**Ліса.**  Пеўнік, галубок, разумны лабок, адчыні!

**Пеўнік** Што табе трэба?

**Ліса.**  Пазыч агню.

**Пеўнік**. Навошта?

**Ліса.** Буду ў печы паліць.

**Пеўнік.** Не адчыню, бо ты схопіш мяне.

**Ліса.**  Ды не, больш не буду хапаць.

**Апавядальнік.** Паверыў пеўнік лісіцы і адчыніў дзверы. А тая — ухапіла яго і панесла. Пеўнік зноў пачаў клікаць коціка:

**Пеўнік.** Коце, браце!
Мяне ліска нясе
У высокія горы,
У глыбокія норы,
Па барах, па карчах,
Аж бярэ мяне страх!..

**Апавядальнік**. Добра, што коцік далёка не адышоўся ад дому: пачуў ён пеўніка, прыбег і адабраў яго ад лісіцы.

**Коцік.** Ну,  калі ты і трэці раз адчыніш лісіцы дзверы, то бяда будзе: цяпер я пайду на паляванне яшчэ далей.

**Пеўнік.** Не,  больш я гэтай ліхадзейцы дзвярэй не адчыню.

**Коцік.** Глядзі ж!  І коцік пайшоў у самыя далёкія лясы.

**Апавядальнік**. Прыбегла лісіца:

**Ліса.**  Пеўнік, галубок, разумны лабок, дай вугалёк!

**Пеўнік**. Не, цяпер я дзверы табе не адчыню!

**Ліса.**  Дык ты праз акенца падай.

**Пеўнік.** Праз акенца можна.

**Апавядальнік**. Адчыніў ён акенца, а лісіца ўхапіла яго і панесла. Крычаў, крычаў пеўнік, ды коцік яго так і не пачуў: вельмі ж далёка ён зайшоў.

Прынесла лісіца пеўніка дахаты і загадала дочкам у печы паліць, з пеўніка крупнік варыць. А сама пайшла гасцей склікаць.

Вярнуўся з палявання коцік, бачыць — няма пеўніка. «Мусіць, яго зноў лісіца ўхапіла, — падумаў коцік. — Як жа яго цяпер з бяды выратаваць?»

Зрабіў ён скрыпачку галасістую ды пайшоў да лісіцы. Прыйшоў, сеў ля варот і зайграў, прыпяваючы:

— Тылі-тылі, скрыпіца,
Тут сядзела лісіца,

**Ліса.** Як жа хараша нехта грае, пабягу паслухаю, а пеўніка зварыць яшчэ паспею.

**Апавядальнік.** Выбегла яна на двор ды і заслухалася. Пеўнік жа тым часам не драмаў: выскачыў з лісіцынай хаткі ды пабег з коцікам дахаты. Так і засталася лісіца ні з чым.

Надзейка: Вельмі прыемна было з вамі пагуляць. Дзякуй вам, дзеці, за прыемны час. Вы ўсе малайцы! Да пабачэння.

Выхавацель: Да пабачэння , лялька Надзейка! Прыходзь да нас яшчэ!

Падрыхтавала: С.В.Грэмяка